продолжение табл. 1

| № п/п | Национальность | 1941 | 1942 | 1943 | 1944 | 1945 | 1946 | 1957-1991 | Итого |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 21 | шорец | | | | 1 | | | | 1 |
| 22 | зырянин | | | | 1 | | | | 1 |
| | **Итого:** | **6** | **2** | **221** | **535** | **409** | **35** | **4** | **1212** |

УДК 385.81

# Існасць лэнд-ліза і яго значэнне для перамогі СССР у ВОВ

Каткавец А. А.
Навуковы кіраўнік Савік С. А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

**Увядзенне.** Ленд-ліз – сістэма перадачы Злучанымі Штатамі Амерыкі ў пазыку або ў арэнду ваеннай тэхнікі і інш. Матэрыяльных сродкаў краін-саюзніц у гады Другой сусветнай вайны [1, с. 647].

Закон аб ленд-лізе быў прыняты ў ЗША ў сакавіку 1941 г. У кастрычніку 1941 г. у Маскве прадстаўнікамі СССР, ЗША і Вялікабрытаніі падпісаны пратакол аб узаемных пастаўках. СССР выказаў гатоўнасць расплачвацца за пастаўкі саюзнікаў сродкамі з залатога запасу. У лістападзе 1941 г. ЗША распаўсюдзілі дзеянне закона аб ленд-Лізе на СССР [2].

**Асноўная частка.** Усяго за гады Другой сусветнай вайны пастаўкі ЗША па ленд-лізу саюзнікам склалі каля 50 млрд дол, з якіх на долю Савецкага Саюза прыйшлося 22 %. На канец 1945 г. пастаўкі ў СССР па ленд-лізу выказаліся ў суме 11,1 млрд дол [3, с. 632].

Зваротныя пастаўкі з СССР у ЗША склалі за 2,2 млн дол. Савецкі Саюз паставіў ЗША 300 тыс. т хромавай руды, 32 тыс. т марганцевой руды, значная колькасць плаціны, золата, лесу.

Акрамя амерыканскага ленд-ліза дапамогу СССР аказвалі таксама Вялікабрытанія і (з 1943 г.) Канада, аб'ём гэтай дапамогі ацаняецца як 1,7 млрд дол і 200 млн дол [4, с. 49].

Першы саюзны канвой з грузамі прыбыў у Архангельск 1941.08.31. З лета па кастрычнік 1942 г. пастаўкі па паўночным маршруце прыпыняліся ў сувязі з разгромам гітлераўцамі каравана PQ-17 і падрыхтоўкай саюзнікамі высадкі ў Паўночнай Афрыцы. Асноўны паток паставак прыйшоўся на 1943–1944 гг., калі ўжо быў дасягнуты карэнны пералом у вайне. Тым не менш, пастаўкі саюзнікаў аказалі не толькі матэрыяльную дапамогу, але і палітычную, маральную падтрымку савецкіх народу ў вайне з фашысцкай Германіяй [4, с. 50].

Па амерыканскіх афіцыйных дадзеных, на канец верасня 1945 г. з ЗША ў СССР адпраўлена 14 795 самалётаў, 7 056 танкаў, 8 218 зенітных гармат, 131 тыс. кулямётаў, 140 паляўнічых за падводнымі лодкамі, 46 тральшчыкаў, 202 тарпедныя катэры, 30 тыс. радыёстанцый і інш. З Вялікаабрытаніі атрымана больш за 7 тыс. самалётаў, св. 4 тыс. танкаў, 385 зенітныя гарматы, 12 тральшчыкаў і інш.; 1188 танкаў дастаўлены з Канады.

Апроч узбраення СССР атрымваў з ЗША па лэнд-лізу аўтамабілі, трактары, матацыклы, судны, лакаматывы, вагоны, харч і іншыя тавары. Авіяцыйныя эскадрылля, полк, дывізія лёталі на амерыканскіх знішчальніках Р-39 «Аэракобра». Амерыканскія грузавыя аўтамабілі «Студэбекер» выкарыстоўваліся ў якасці шасі для «Кацюш» [4, с. 50–51].

Для ажыццяўлення дастаў у СССР выкарыстоўвалася тры асноўныя маршруты – ціхаакіянскі, трансіранскі і арктычны. Яны забяспечылі ў суме 93,5 % агульных дастаў. Ніводны з гэтых маршрутаў не з'яўляўся цалкам бяспечным. Самым хуткім (і самым небяспечным) маршрутам былі арктычныя канвоі. Яшчэ адным шляхам з'яўляўся паветраны маршрут з Аляскі ва Ўсходнюю Сібір, па якім амерыканскія і савецкія лётчыкі даставілі ў СССР 7,9 тыс. самалётаў. Працягласць паветранага маршруту дасягала 14 тыс. км. З 1945 г. выкарыстоўваўся і маршрут праз Чорнае мора [4, с.51-54].

На жаль, некаторая частка дастаў хаўруснікаў не даходзіла да СССР, бо знішчалася гітлераўскім ВМФ і люфтвафэ пры марскіх пераходах транспартаў.

Усяго з чэрвеня 1941 г. па верасень 1945 г. СССР скіравана 17,5 млн т. розных грузаў, дастаўлена да месца прызначэння 16,6 млн т (астатнія склалі страты пры патапленні суднаў). Пасля капітуляцыі Германіі ЗША спынілі даставы па лэнд-лізу ў еўрапейскую частку СССР, але пэўны час працягвалі іх на Далёкі Усход у звязку з вайной супраць Японіі [3, з. 632].

**Заключэнне.** І. В. Сталін у 1945 г. выказаў думку, што савецка-амерыканскае пагадненне па лэнд-лізу згуляла важную ролю і «у значнай ступені спрыяла паспяховаму завяршэнню вайны супраць агульнага ворага». Апроч стратэгічнага ўзаемадзеяння з СССР, лэнд-ліз прыносіў ЗША пэўную эканамічную выгаду.

У паваенныя гады паміж СССР і ЗША неаднаразова вяліся перамовы пра разлікі па лэнд-лізу. СССР вярнуў ЗША частку атрыманай ім маёмасці і выявіў гатовасць аплаціць астатняе, аднак ва ўмовах распачатай «халоднай вайны» пагадненне дасягнута не было [5, с. 143–152].

**Літаратура**

1. Ленд-лиз // Русский орфографический словарь [Электронная версия] / Российская академия наук. Институт русского языка им. В. В. Виноградова / О. Е. Иванова, В. В. Лопатин (отв. ред.), И. В. Нечаева, Л. К. Чельцова. – 2-е изд., 2004. – 1040 с.

2. Закон о ленд-лизе. История США в документах. – Перевод закона на русский язык.

3. Куманёв Георгий Александрович. Говорят сталинские наркомы. – Смоленск : Русич, 2005. – 800 с.

4. Джонс Р.Х. «Ленд-лиз. Дороги в Россию. Военные поставки США в СССР во Второй мировой войне. 1941–1945» / Пер. с англ. А. Л. Андреева. – М. : ЗАО Центрполиграф, 2015 – 350 с. – (На линии фронта. Правда о войне), 186 с.

5. Соглашение между Правительством СССР и Правительством Соединённых Штатов Америки о торговле (Заключено в г. Вашингтоне 18.10.1972) // Сборник торговых договоров и соглашений по торгово-экономическому сотрудничеству СССР с иностранными государствами (на 1 января 1977 года). – М. : Экономика, 1977, 1977. – 280с.

УДК 385.81

## Освобождение Беларуси летом 1944 года

Кравченко В. А.
Научный руководитель Капкович М. И.
Белорусский национальный технический университет

В конце апреля 1944 г. Ставкой Верховного Главнокомандования было принято решение о проведении летом 1944 г. Белорусской наступательной операции. Непосредственную разработку стратегического плана по осуществлению Белорусской наступательной операции было поручено заместителю начальника Генерального штаба А. И. Антонову – уроженцу Беларуси.

Разработанный стратегический план по проведению данной операции получил название – операция «Багратион».

В мае 1944 г. план наступательной операции был окончательно разработан и утвержден.

Особенностью операции было одновременное нанесение шести мощных ударов по противнику.

1-й Прибалтийский и 3-й Белорусский фронты наступали севернее. Они должны были уничтожить врага в районе Витебска, Борисова и развивать наступление на Минск.